УДК 9(476)«1917/18»:355(470)

М. Я. Сяменчык, дацэнт

# РАСІЙСКАЯ АРМІЯ І ЖЫХАРЫ БЕЛАРУСІ НА ЗЛОМЕ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

The article dwells upon the situation in Belarus from the period of the command's preparation of the offensive operation against German and Austrian troops (spring – summer 1917) to the end of the First World War in November, 1918. The author studies state of soldiers' opinion and their action concerning the question of military operation continuation both after the February and October revolutions and in connection with the Civil War and the German offensive in 1918.

**Уводзіны.** Першая сусветная вайна замацавалася ў свядомасці сучаснікаў як несправядлівая, імперыялістычная, а ўдзел у ёй Расіі – як праява рэакцыйнай палітыкі царскага, а затым і Часовага ўрадаў [1, с. 11–14]. Іншых ацэнак не магло і быць, бо «адзіна правільныя» ідэі ўкараняліся тымі, хто прыйшоў да ўлады ў Кастрычніку 1917 г. і затым ператварыў вайну «імперыялістычную» ў «рэвалюцыйную» [2, с. 43], «найсправядлівейшую», «нашу слаўную грамадзянскую» вайну [3, с. 100]. Сёння прагрэсіўныя расійскія гісторыкі адкінулі бальшавіцкую канцэпцыю рэвалюцый 1917 г. [4], а нашы партыйныя публіцысты па-ранейшаму, у традыцыях «Политического собеседника» ўслаўляюць сваіх саратнікаў, мусіруюць «версіі» пра «жыда-масонаў», сіяністаў, проста яўрэяў і г. д. [5]. Зразумела, што ацэнка гэтых твораў за межамі навуковых крытэрыяў.

Мяркуем, што настроі і паводзіны нашых суайчыннікаў у час сусветнай вайны ўяўляюць значную навуковую цікавасць. Вывучэнне ўсіх крыніц па гэтай праблеме – ад твораў У. І. Леніна да ненавісных квазігісторыкам «истлевших бульварно-желтых газетенок» [6] – дапаможа дакладней акрэсліць становішча на Беларусі напярэдадні і ў час рэвалюцый 1917 г. і дэталізаваць працэс перарастання сусветнай вайны ў грамадзянскую.

**Асноўная частка.** З пяці расійскіх франтоў, якія ў 1917 г. стрымлівалі націск Германіі і яе саюзніц, два – Заходні і (часткова) Паўночны размяшчаліся на тэрыторыі Беларусі. Тут трымала абарону каля 2 млн. чалавек [7, с. 22]. У гэты час адбывалася падрыхтоўка расійскіх узброеных сіл да рашучага наступлення. Тыл рабіў усё магчымае, каб дапамагчы сваім абаронцам. Колькасць аграрных правапарушэнняў сышло на нішто, бо для памешчыкаў і сялян асноўнай праблемай з'яўлялася апрацоўка зямлі. Невыпадкова кошт працы работніка (акрамя яго харчавання) у маёнтку складаў 800 руб. у год. [8, спр. 623, л. 67].

Рабочы клас, заняты ў прамысловасці, на чыгунцы, у арганізацыях Земскага і Гарадскога саюзаў і інш., выконваў свае абавязкі і не парушаў законаў ваеннага часу. Нягледзячы на недахоп спажывецкіх тавараў, інфляцыю, рост цэн і г. д., працоўныя з паразуменнем ставіліся да цяжкасцей і не прад'яўлялі ўладам надзвычайных прэтэнзій [7, с. 10].

Інфармацыя, быццам прыфрантавая Беларусь была пастаўлена на грань эканамічнай катастрофы, надзвычай перабольшана. У. Я. Казлякоў піша, што «Мінск, Віцебск, Гомель апынуліся ў студзені 1917 года перад прывідам голаду – няма ні хлеба, ні мяса, ні паліва» [6]. Па-першае, нават тады паліва не ўжывалася ў якасці ежы. Па-другое, «голад» – паняцце аднос-нае. Так, «Могилёвский вестник» за 7 лютага паскардзіўся на «каўбасны голад». 23 лютага «Минский голос» паведаміў, што дума, каб не раздражняць бедныя пласты насельніцтва, пастанавіла забараніць выраб пірожных і канфет. Характэрна, што адразу пасля Лютаўскай рэвалюцыі харчовыя цяжкасці былі пераадолены.

Аднаснаму грамадскаму спакою спрыяла адпаведная маральна-псіхалагічная і ідэалагічная апрацоўка насельніцтва. Пасля страты Расіяй велізарных тэрыторый, у тым ліку паловы Беларусі, вайна больш адпавядала назве «Другая Айчынная», чым «імперыялістычная». Прэса ўкараняла ў грамадскую свядомасць ідэю аб неабходнасці ўсебаковай падтрымкі арміі для давядзення вайны да пераможнага канца і ганаровага міру. З гэтай нагоды ў канцы снежня 1916 – пачатку 1917 гг. у гарадах Беларусі прайшлі кампаніі па зборы сродкаў на карысць акопнікаў, інвалідаў, сірот і сямей ніжніх чыноў. У вёсках пад наглядам валасных упраў адбываўся збор ахвяраванняў ў выглядзе грошай і прадуктаў [7, с. 11–12].

Значную ролю ва ўмацаванні ідэйна-маральнага духу абаронцаў Айчыны і жыхароў адыгрывала Руская праваслаўная царква. Яе іерархі наведвалі блізкія да ліній абароны прыходы, бывалі ў лазарэтах і г. д. РПЦ здзяйсняла вялікую дабрачынную працу: займалася зборам па-

дарункаў для франтавікоў, клапацілася аб хворых і параненых, сем'ях вайскоўцаў [9].

Прапаганда левых плыняў эсэраў і сацыял-дэмакратаў, якія выступалі за паражэнне Расіі ў вайне, на Беларусі істотнага распаўсюджання не мела. Ледзь прыкметная антыўрадавая актыўнасць назіралася ў асяроддзі служачых Земгара і яўрэйскіх рабочых [7, с. 9–13]. Прыкметы стомленасці ад вайны выяўляліся толькі ў армейскім асяроддзі. Так, у кастрычніку 1916 г. у Гомелі адбыўся салдацкі бунт. Акрамя таго, падчас аблаў паліцэйскія затрымлівалі не толькі дэзерціраў, але і цывільных асоб, якія ўхіляліся ад мабілізацыі [7, с. 8].

Што датычыцца асноўнай масы насельніцтва Беларусі, то яно адкрыта не выказвала незадавальнення сваім становішчам і цярпліва выконвала свае грамадзянскія абавязкі. Чуткі аб хуткім заканчэнні вайны былі настолькі моцнымі, што сталі вяртацца бежанцы. Так, 25 лютага 1917 г. мінскі губернскі земскі сход разглядаў праект аб інвакуацыі 10 тыс. бежанцаў, а на адрас губернатара паступалі тысячы хадайніцтваў аб вяртанні дадому [10, спр. 6, л. 9].

Такім чынам, Беларусь зусім не нагадвала той рэгіён імперыі, дзе «нарастала бура народнага гневу» [6]. На справе ім зрабіўся Петраград, дзе 27 лютага 1917 г. перамагло ўзброенае паўстанне рабочых і салдат. Каб утрымаць сітуацыю пад кантролем, Дзяржаўная дума і вышэйшы генералітэт ахвяравалі манархіяй. Сам манарх адрокся ад трона, матывуючы сваё рашэнне імкненнем заспакоіць «унутраныя народныя хваляванні» перад неабходнасцю «давядзення вайны, у што б тое ні стала, да перамаганоснага канца» [7, с. 18]. Часовы ўрад на чале з Г. Я. Львовым таксама выказаў намер працягваць вайну.

Усе масавыя маніфестацыі з нагоды звяржэння самаўладдзя прайшлі пад лозунгам падтрымкі новага ладу і працягу вайны як гарантыі абароны рэвалюцыі ад германскай навалы. Насельніцтва Беларусі, франтавыя і гарнізонныя вайскоўцы таксама выказаліся ў падтрымку Часовага ўрада, яго ўнутранай і знешняй палітыкі. Беларускае сялянства адгукнулася на яго заклікі аб дапамозе рэвалюцыйнай арміі. У сакавіку на Беларусі патрабаванняў неадкладнага міру ці заканчэння вайны ніхто не выстаўляў. Так, 7 сакавіка на сходзе грамадскасці Мінска, між іншым, было заяўлена, што «ў адносінах да вайны нашым лозунгам павінна быць поўная перамога над знешнім ворагам» [11, с. 19].

Але ў «Загадзе № 1» Петраградскага Савета ад 1 сакавіка, які неўзабаве распаўсюдзіўся па гарнізонах і франтах, абвяшчалася аб утварэнні ва ўсіх часцях салдацкіх камітэтаў, якія не падпарадкоўваліся камандзірам па палітычных пытаннях. Наступны ўдар па баяздольнасці арміі быў нанесены зваротам Петрасавета ад 14 сакавіка да народаў свету з заклікам да спынення вайны. У выніку наступальніцкі настрой расійскіх салдат рэзка знізіўся. Не менш разбуральныя наступствы такога ж кшталту мела ажыццяўленне кіраўнікамі ваеннага міністэрства так званай дэмакратызацыі (звальненне асобных генералаў, наданне салдатам грамадзянскіх правоў) і палітызацыі (утварэнне партыйных арганізацый, удзел у грамадскіх і ўрадавых установах) узброеных сіл. У выніку прысяга, дысцыпліна і загад камандзіра гублялі сілу, а армія паступова страчвала сваю галоўную функцыю.

Да кастрычніка 1917 г. грамадскасць Беларусі, у тым ліку гарнізонныя вайскоўцы (за выключэннем бальшавікоў), цалкам давяралі Часоваму ўраду. За ўвесь час яго існавання тут не адбылося ніводнага палітычнага выступлення з антыўрадавымі лозунгамі. На ўсіх маніфестацыях, якія адбыліся ў гарадах Беларусі 18 чэрвеня, іх удзельнікі выказаліся ў падтрымку наступлення расійскай арміі. Характэрнай праявай патрыятычнага ўздыму, які назіраўся ў прыфрантавой Беларусі, стала фарміраванне часцей георгіеўскіх кавалераў, ударнікаў, нават добраахвотніц-жанчын [7, с. 102].

Жорсткае паражэнне, якое пацярпелі войскі Паўднёва-Заходняга і Заходняга франтоў, акрамя іншага, сведчыла аб заняпадзе вайсковай дысцыпліны. Каля тысячы «абаронцаў Айчыны», якія адмовіліся выконваць загады камандзіраў, былі змешчаны ў мінскую турму.

У той самы час 3–4 ліпеня небывалую наступальніцкую актыўнасць выявілі часці петраградскага гарнізона на чале з бальшавікамі і анархістамі, калі здзейснілі спробу звяржэння Часовага ўрада. Ударнай сілай путчыстаў былі вайскоўцы, якія яшчэ ў сакавіку 1917 г. дамагліся права пастаяннай дыслакацыі ў сталіцы пад выглядам абароны яе ад контррэвалюцыі.

Заклапочанасць гэтымі часцямі выказалі і арганізатары жнівеньскай Дзяржаўнай нарады ў Маскве. Адным з яе вынікаў стала пагадненне паміж міністрам-старшынёй А. Ф. Керанскім і Вярхоўным галоўнакамандуючым генералам Л. Г. Карнілавым аб умацаванні сталічнага гарнізона надзейнымі казацкімі войскамі. Але ў выніку непаразумення або правакацыі рух гэтых войск у напрамку Петраграда быў успрыняты як спроба ўсталявання ваеннай дыктатуры. Дзякуючы энергічным намаганням «рэвалюцыйнай дэмакратыі», у тым ліку Часовага рэвалюцыйнага камітэта Заходняга фронту, на Беларусі канфлікт быў вырашаны без кравапраліцця. Генерал Карнілаў, усведамляючы небяспеку ўзнікнення грамадзянскай вайны, не пайшоў на абвастрэнне канфлікту [12, с. 3–12].

Іншая справа, што з падаўленнем карнілаўскага мяцяжу аўтарытэт камандзіра заняпаў яшчэ больш, а ваенны шлях дасягнення міру быў

адкінуты канчаткова. Бальшавікі ўжо амаль адкрыта сталі звязваць ідэю спынення вайны з пераходам улады да Саветаў.

Да часу, пакуль дзеючая армія выказвала настрой абараняць Айчыну, беларускае сялянства дзялілася з франтавікамі хлебам, дэманструючы высокую грамадзянскасць і патрыятызм. Таленавіты даследчык І. М. Рыжанкоў даказаў, што бадай нідзе больш, як на Беларусі, насельніцтва і салдаты не бралі такога актыўнага ўдзелу ў падпісцы на Пазыку Свабоды. Ён таксама заўважыў, што са зніжэннем наступальніцкіх настрояў і патрыятычнага ўздыму адбылося пагаршэнне забеспячэння арміі сялянскім хлебам [13, с. 19].

Характэрна і тое, што з восені грамадскасць Беларусі ўжо не выяўляла ілюзій адносна перамогі над германцамі, а спыненне вайны звязвала толькі з Устаноўчым сходам. Звесткі, быццам «на выбарах дэпутатаў ІІ з'езда Саветаў беларусы ахвотна галасавалі за бальшавікоў» [6], з жанру баек, бо такой ахвоты беларусы не выказвалі.

У. Ленін меў рацыю, калі казаў, што пытанні ўзяцця ўлады вырашаюцца не з'ездамі, «хаця б нават з'ездамі Саветаў», а паўстаннем [14, с. 435]. Менавіта таму ён не прысутнічаў на першым пасяджэнні з'езда, а займаўся штурмам Зімняга і іншымі аперацыямі. Толькі на другім пасяджэнні 26 кастрычніка ў 21 гадзіну У. Ленін выступіў перад дэлегатамі з дакладам аб міры. У аднагалосна прынятым дэкрэце ўсім народам і іх урадам прапаноўвалася пачаць перагаворы аб заключэнні агульнага міру без анексій і кантрыбуцый. У ліку важнейшых пастаноў з'езда былі дэкрэт аб зямлі, утварэнне Часовага рабоча-сялянскага ўрада (СНК) і інш.

Грамадскасць краіны, у тым ліку Беларусі, успрыняла паўстанне рабочых і салдат Петраграда супраць Часовага ўрада як спробу бальшавікоў захапіць уладу, небяспеку зрыву выбараў ва Ўстаноўчы сход і пагрозу грамадзянскай вайны [15, с. 6]. З гэтай нагоды ні ў адным населеным пункце Беларусі ўрачыстых мерапрыемстваў не адбывалася, а прыхільнікі дэмакратыі аб'ядналіся ў Камітэты выратавання рэвалюцыі. Актыўную падтрымку бальшавіцкаму ўраду выказалі ўзброеныя сілы, у тым ліку салдаты Заходняга фронту, якія зрабіліся апорай Саветаў як органаў дзяржаўнай улады. Менавіта салдаты ўзялі ў свае рукі справу заключэння перамір'яў з германцамі, калі да гэтага заклікалі У. І. Ленін і новы Вярхоўны галоўнакамандуючы прапаршчык М. В. Крыленка.

Большасць франтавікоў успрыняла дэкрэт аб міры як факт выхаду Расіі з вайны. А дэкрэт аб зямлі, па словах сучасных гісторыкаў, «зрабіўся для сялян, апранутых у салдацкія шынялі, той спакусай, пераадолець якую было немагчыма. Натоўпы салдат хлынулі з фронта дадому дзяліць зямлю» [16].

У тых умовах салдат губляў уласцівасці абаронцы Айчыны і ператвараўся ў «чалавека з ружжом». Яшчэ з лета 1917 г. гарнізонныя вайскоўцы сталі ўяўляць небяспеку для яўрэйства, а пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі яны ўчынілі пагромы ў Глыбокім, Рэчыцы [17], Койданаве, Радашковічах і іншых пунктах [15, с. 49].

Як вядома, разлік У. Леніна і Л. Троцкага на сусветную рэвалюцыю, а разам з ёю – на заканчэнне вайны, не спраўдзіўся. Але сепаратнае перамір'е дазваляла ім узмацніць націск на «ўнутраную контррэвалюцыю», да якой адносіліся праціўнікі «Савецкай улады» (чытай – бальшавікоў). На Беларусі першымі бальшавіцкімі ахвярамі сталі афіцэры, расстраляныя непадалёк ад Жлобіна [18, с. 215], абвешчаны «ворагам народа» [19, с. 249] і забіты ў Магілёве генерал Духонін. Шматлікія ахвяры мелі месца ў выніку справакаванага бальшавікамі канфлікту з І Польскім корпусам [20, с. 139–150].

З разгонам Устаноўчага схода надзея на мір, па словах В. М. Чарнова, «не шкурніцкі, не сепаратны, а ўсеагульны дэмакратычны мір» [21] знікла. «Кавалерыйская атака на капітал» дала бальшавіцкаму ўраду магчымасць ў 10 разоў павялічыць жалаванне добрахвотнікам. Але жадаючых служыць было няшмат: сярод іх – тыя, чыя радзіма заставалася пад акупацыяй (латышы, палякі), хто застаўся без сродкаў да існавання (афіцэры, служачыя франтавых арганізацый і інш.). У цэлым, гэтыя войскі прызначаліся для барацьбы з «унутранай контррэвалюцыяй», але ніяк не з германцамі. Мінскія бальшавікі А. Мяснікоў, В. Кнорын, К. Ландэр і інш. цалкам падзялялі тактыку свайго ЦК [22], таму і не панеслі пакарання за катастрафічныя вынікі свайго кіравання Заходнім фронтам і Беларуссю. Наадварот, атрымалі больш прэстыжныя і менш адказныя пасады ў Смаленску.

Бальшавікі здолелі захаваць сваю ўладу і, карыстаючыся Брэсцкім мірам, сталі імкліва яе ўмацоўваць усімі спосабамі, у тым ліку шляхам «чырвонага тэрора».

Германія і яе саюзнікі захапілі значныя трафеі і матэрыяльныя рэсурсы акупіраваных тэрыторый і разам з імі магчымасць для далейшай барацьбы з Антантай. У выніку, дзякуючы У. Леніну, Л. Троцкаму і інш., сусветная вайна скончылася значна пазней і далёка не на карысць Расіі. Пасля эвакуацыі германскіх войск, дэнансацыі Брэсцкага дагавора і заканчэння сусветнай вайны беларускі народ так і не набыў доўгачаканага міру.

**Заключэнне.** Такім чынам, насельніцтва Беларусі і размешчаныя на яе тэрыторыі расійскія войскі ў канцы 1916 – пачатку 1917 гг. мелі падставы спадзявацца на заканчэнне вайны. Пасля правалу летняга наступлення расійскай арміі асноўныя надзеі на мір звязваліся з Устаноўчым сходам. З прыходам да ўлады бальшавікоў беларускі народ трапіў у рэчышча іх палітыкі,

якая грунтавалася на прыярытэтах сусветнай рэвалюцыі, дыктатуры пралетарыяту і інтэрнацыяналізму. У выніку, цяжар вайны з Германіяй узмацніўся вайной грамадзянскай.

**Літаратура**


1. Великий Октябрь и защита его завоеваний. Победа социалистической революции / отв. ред. И. Минц. – М.: Наука, 1987. – 480 с.
2. Семанов, С. Н. Брусилов / С. Н. Семанов. – М.: Мол. гвардия, 1980. – 318 с.
3. Акшинский, В. С. Климент Ефремович Ворошилов: биогр. очерк / В. С. Акшинский. – 3-е изд., доп. – М.: Политиздат, 1979. – 286 с.
4. Революции в мифах и наяву // Российская газета. – 2007. – 3 ноября.
5. Козляков, В. Е. Из истории красного террора в Беларуси (октябрь 1917–1920 гг.) / В. Е. Козляков // Труды БГТУ. Сер. V, Политология, философия, история, филология. – 2007. – Вып. XV. – С. 71–76; Новік, Я. К. Расійскія рэвалюцыі 1917 г. у лёсе Беларусі / Я. К. Новік // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008.– № 1. – С. 5–7; Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г.: вучэб. дапам. / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік; пад рэд. Я. К. Новіка. – Мінск: Выш. шк., 2009. – 512 с.
6. Белорусская нива. – 2007. – 24 окт.
7. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.): у 2 ч. / М. Я. Сяменчык. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2001. – Ч. I: Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах дэмакратычнага рэжыму. – 200 с.
8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 2084. – Воп. 1. Справы Магілёўскага губернскага земства.
9. Минские епархиальные ведомости. – 1917. – № 7–8. – С. 131; Могилевские епархиальные ведомости. – 1917. – № 2. – С. 208.
10. НГАБ. – Фонд 1265. – Воп. 1. Журнал VI Мінскага губернскага земскага схода.
11. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё ў Мінску (сакавік – кастрычнік 1917 г.) / М. Я. Сяменчык. – Мінск: 1994. – 112 с.
12. Сяменчык, М. Я. Керанскі супраць Карнілава: чыя перамога? / М. Я. Сяменчык // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 8.
13. Рыжанкоў, І. М. Сялянства Беларусі ў вырашэнні грамадска-палітычных і эканамічных праблем (сакавік – кастрычнік 1917 г.): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02. / І. М. Рыжанкоў; Бел. дзярж. тэхнал. ун-т. – Мінск, 2006. – 24 с.
14. Ленин, В. И. Полн. собр. соч. Т. 34.
15. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.): у 2 ч. / М. Я. Сяменчык. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2001. – Ч. II: Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах складвання таталітарнага рэжыму. – 160 с.
16. http://www.mod.mil.by/11krasnaja.html
17. Сяменчык, М. Я. Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця і рэцыдывы антысемітызму на Беларусі (вясна – восень 1917 г.) / М. Я. Сяменчык // Труды БГТУ. Сер. V, Политология, философия, история, филология. – 2004. – Вып. XII. – С. 7–14.
18. В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте. Воспоминания активных участников Октябрьской революции / Под ред. Н. А. Халипова, Н. М. Мешкова. – Минск: Гос. изд-во БССР, 1957. – 372 с.
19. Октябрьский переворот / сост. А. Л. Попов. – Петроград: Новая эпоха, 1918. – 415 с.
20. Сяменчык, М. Я. Польскія вайсковыя арганізацыі і фарміраванні на Беларусі ў 1917–1918 гг. // Праблемы айчыннай і сусветнай гісторыі (Да 60-годдзя доктара гістарычных навук, прафесара У. М. Міхнюка): матэрыялы навуковых чытанняў, г. Брэст, 28 верасня 2007 г.; Брэст. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна; аргкам.: М. Э. Часноўскі і інш.; рэдкал.: У. В. Здановіч, А. А. Савіч (адк. рэд.), І. І. Шаўчук. – Брэст: БрДУ, 2008. – 173 с.
21. Чернов, В. М. Перед бурей. Воспоминания / В. М. Чернов. – Нью-Йорк: Издательство имени Чехова, 1953. – 413 с.
22. Звезда. – 1918. – 19 февр.